# І МУДРАСЦІ, І ВЕДАЎ ХРАМ

## ДА 100-ГОДДЗЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ

*Любіце кнігу, бо яна – крыніца мудрасці, ведаў і навукі, лекі для душы.*

Францыск Скарына

*Да чытачоў "Роднага слова"*

**Дарагія сябры!**

Нацыянальная бібліятэка Беларусі з'яўляецца галоўнай універсальнай навуковай бібліятэкай нашай краіны, рэспубліканскім інфармацыйным і сацыякультурным цэнтрам, скарбніцай нацыянальнай памяці і асабліва каштоўным аб'ектам нацыянальнай спадчыны.

Бібліятэка – захавальніца магутнага інфармацыйнага рэсурсу, унікальнае кнігасховішча, дзе знаходзіцца самы вялікі ў краіне фонд выданняў і помнікаў пісьменства, каштоўнасцяў айчыннай і сусветнай культуры.

На працягу стагоддзя Нацыянальная бібліятэка паспяхова выконвае адказную справу збірання, захавання, вывучэння і папулярызацыі беларускай і сусветнай кніжнай спадчыны і такім чынам забяспечвае духоўную і інтэлектуальную пераемнасць пакаленняў, стварае ўмовы для ўзбагачэння ўнутранага свету і раскрыцця творчага патэнцыялу шырокага кола сваіх карыстальнікаў. Яна ўдзельнічае ў фарміраванні дзяржаўнай бібліятэчнай палітыкі, у распрацоўцы напрамкаў і праграм развіцця галіны, з'яўляецца вядучай установай па прыкладных навуковых даследаваннях у бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве і кнігазнаўстве.



Рэалізуючы функцыі сацыякультурнага цэнтра, галоўная бібліятэка краіны аператыўна задавальняе запыты карыстальнікаў і развівае традыцыі культурна-асветніцкай установы сусветнага значэння, спрыяе гуманізацыі грамадства.

Штогод бібліятэку наведвае каля 250 тысяч чалавек. Праводзіцца каля 200 мерапрыемстваў, пры гэтым практычна кожнае трэцяе мае міжнародны характар. Гэта сустрэчы з навуковай і творчай інтэлігенцыяй, мерапрыемствы навукова-тэарэтычнага і адукацыйнага кірунку, тэатральныя і канцэртныя праграмы, кніжныя і мастацкія выстаўкі, цырымоніі ўручэння калекцый і прэзентацыі кніг. За апошнія пятнаццаць гадоў на рахунку бібліятэкі – больш за дзве тысячы кніжных выставак, каля 300 выставачных праектаў, у тым ліку міжнароднага фармату.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі як самы буйны ў дзяржаве інфармацыйны і сацыякультурны

цэнтр папулярызуе нацыянальную літаратурную спадчыну і за межамі краіны праз рэалізацыю праекта “Беларусь сёння”. Штогод найбуйнейшым бібліятэкам свету перадаюцца ў дар беларускія выданні, што найбольш глыбока адлюстроўваюць яе шматвекавую гісторыю і культуру, а таксама сучасны сацыяльна-эканамічны і палітычны стан краіны. Падборка кніг уключае камплект выданняў – лаўрэатаў нацыянальнага конкурсу “Мастацтва кнігі” і іншых прэстыжных прэмій.

У верасні 2022 года Нацыянальная бібліятэка Беларусі адзначыць 100-годдзе з дня заснавання. З гэтай нагоды на 41-й сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА было прынята рашэнне аб унясенні знакавага юбілею ў спіс памятных дат, што пацвярджае значны ўнёсак бібліятэкі ў развіццё сусветнай культуры. Такое супрацоўніцтва спрыяе інтэграцыі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў сусветную бібліятэчную супольнасць і дазваляе ўзбагаціць нашу дзейнасць па захаванні і выкарыстанні культурнага здабытку краіны.

**Аксана КНІЖНІКАВА,**
генеральны дырэктар
Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.